УДК 2(476)+1(476)

# СЯРЭДНЯВЕЧНАЯ БЕЛАРУСЬ У ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ "ЭКСПАНСІІ" ЕЎРОПЫ

***В. Б. Евароўскі***, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,
Інстытут філасофіі НАН Беларусі, г. Мінск, РБ

*З пазіцый гісторыка-філасофскай рэканструкцыі разглядаецца дынаміка інтэлектуальнага, геапалітычнага і каштоўнаснага ўплыву ядра Еўрапейскай культуры на філасофскае развіццё Беларусі ў XI–XVI стст. Паслядоўна рэпрэзентуюцца працэс хрысціянскай энкультурацыі і рэнесанснага ўплыву. Асаблівая ўвага надаецца тым мадыфікацыям, якія гэтыя каранёвыя еўрапейскія ідэі перажываюць у нетрах беларускай інтэлектуальнай культуры. Робіцца высноварыва, што нягледзячы на запазненне, Беларусь у цэлым удала адаптавала успрыманыя ідэі і каштоўнасці.*

Апісанне "Зямлі І" (апошняя чвэрць XII ст.) ахапляе чатыры гарады – Кіеў, Ноўгарад, Полацк, Смаленск: "Еўропай завецца трэцяя частка зямлі, яна размешчаная ў дзвюх з васьмі частак гарызонту, заходняй і паўночна-заходняй, і цягнецца да паўночнага ўсходу. Ва Усходняй Еўропе знаходзяцца Гардарыкі, там ёсць Кэнугард (Кіеў – *В. Е.*) і Хольмгард (Ноўгарад Вялікі – *В. Е.*), Палтескья і Смалескья"(фрагмент з сярэднявечнай ісландскай сагі) [1, с. 130].

Адным з сімвалаў старажытнай усходнеславянскай цывілізацыі, тых першых метафарычных кропак, якімі і цяпер пазначаецца беларуская культура, з'яўляўся "шлях з вараг у грэкі". Спрадвеку першапачатковая дзяржаўнасць, якая ўзнікла на гэтых землях, разглядалася як нейкі шлях, што звязаў сярэднявечную Скандынавію з Візантыяй.

У 1159 г. у вусці Заходняй Дзвіны з'явіліся немцы, пачалася кампанія крыжакоў па засваенні Прыбалтыкі. Дагэтуль спарадычныя кантакты земляў Старажытнай Русі з Pax Romana пачалі перарастаць ва ўстойлівыя сувязі. Так Русь як краіна гарадоў, выцягнутая з паўночнага захаду на поўдзень, пачала ператварацца ў тэрытарыяльную адзінку з устойлівай воссю з усходу на захад.

Такім чынам, у свядомасці старажытнарускай палітычнай эліты пачынае ўкараняцца новая геапалітычная карціна, якая па шматлікіх параметрах падобная да сучаснай. Яе аснова – цвёрды падзел свету на Захад і Усход. У гэтых умовах вектар *Захад – Усход* становіцца дамінуючым, з аднаго боку, у выніку сваёй большай культурнай прыцягальнасці, з іншага – ад немагчымасці выбару, паколькі другой альтэрнатывай станавілася духоўная ізаляцыя, якая ва ўмовах нашага адносна невялікага сярэднявечнага культурнага поля, магла стаць фатальнай.

З перыяду прыняцця Літвой хрысціянства па рымскім абрадзе мы пачалі існаваць ва ўмовах нейкай двухканфесійнай раўнавагі, што падтрымлівалася тымі палітычнымі сродкамі, якія прапаноўвала саслоўна-феадальная структура грамадства, што існавала ў тую эпоху. Аднак, тая памяркоўнасць, што арганізоўвалася на гэтых землях палітычнымі шляхамі, мела не толькі сацыяльныя наступствы, але і прамыя духоўна-ідэалагічныя імплікацыі. Сітуацыя, у якой дзве веры маглі суіснаваць больш-менш мірна, абумовіла калі не абмен каштоўнасцямі, дык ведамі, у прыватнасці, філасофскімі і метадалагічнымі асновамі пабудовы рацыянальнай канструкцыі свету [2].

© Евароўскі В.Б., 2015

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

З іншага боку, тое ж становішча Вялікага княства Літоўскага і тая палітыка, што праводзілася гэтай дзяржавай, стварала для прадстаўнікоў як праваслаўнай, так і каталіцкай канфесій магчымасць падарожнічаць у краіны Заходняй Еўропы. Такім чынам, культура нашага рэгіёна, нягледзячы на рэлігійную разнастайнасць, атрымлівала адзіны ўзор філасофскага характару, які можа разглядацца як дадатковы фактар для кансалідацыі духоўнай і палітычнай эліты грамадства. Другой важнай умовай стабільнасці была адзіная прававая сістэма.

Аднак, з іншага боку, нягледзячы на тое, што з пункту гледжання ідэалагічнай парадыгмы ўсходні і заходні варыянты хрысціянства ў разглядаемы перыяд сярэднявечча ўжо выступалі пэўнымі антаганістамі, яны ўсё ж былі пабудаваны на адзіных семантычных і філасофскіх прынцыпах. Гэта значыць мае месца тая сітуацыя, калі людзі і пэўныя сістэмы культур, нават адчуваючы ўзаемную непрыязнасць, маглі спрачацца і проста падтрымліваць стасункі ў межах адзінай камунікатыўнай сістэмы [3].

У гэтым дачыненні мы можам казаць пра пэўныя каштоўнасці пазаідэалагічнага характару, якія нават ва ўмовах канфлікту іншых сфер дзейнасці з'яўляюцца аб'яднальнымі для розных тыпаў культур. Тут варта прыгадаць, напрыклад, што ў межах разглядаемай культурнай сітуацыі беларускага сярэднявечча структуры філасофскага парадку могуць аднолькава паспяхова выкарыстоўвацца для абгрунтавання як праваслаўных, так і каталіцкіх ідэалагем. Спатрэбілася яшчэ некалькі стагоддзяў беларускай інтэлектуальнай гісторыі да таго часу, пакуль была дасягнута пэўная сінхранізацыя нашай рэгіянальнай культуры з агульнаеўрапейскай традыцыяй. З іншага боку, прыкладна столькі ж часу спатрэбілася для стварэння адносна аўтаномнай адукацыйнай сістэмы і, нарэшце, гэты працэс стаў магчымым, толькі ў тых умовах, калі беларускія землі паўнавартасна ўвайшлі ў камунікатыўнае асяроддзе еўрапейскай культуры.

З'яўляецца неадменным фактам тое, што цяпер у маштабах усяго чалавецтва пануе тая адукацыйная сістэма, якая склалася на аснове традыцый еўрапейскіх універсітэтаў. З іншага боку, калі мы возьмем усю сучасную навуку, то яна цесна звязана са светапоглядными асновамі грамадства менавіта заходнееўрапейскага або тэхнагеннага тыпу [4]. Па сутнасці мы можам казаць пра тое, что напрыканцы эпохі сярэднявечча еўрапейская цывілізацыя ў галіне ведаў стварыла гатовы экспартны прадукт, які дзякуючы сваёй сістэматызаванай і таму цэласнай прыродзе мог стаць асновай для фарміравання тэарэтычнай асновы любой лакальнай культуры. І ў гэтым дачыненні як у разглядаемы намі перыяд, так і ў больш позні эпохі менавіта гэта еўрапейская сістэма адукацыі не мела канкурэнцыі. Гэты, гаворачы сучаснай мовай, адукацыйны стандарт станавіўся падасновай той камунікатыўнай асновы адзінай хрысціянскай цывілізацыі.

Аднак натуральна, што ўплыў еўрапейскай сістэмы ведаў не мог абмяжоўвацца толькі стварэннем нейкай метамовы, якая забяспечвала камунікаванне на шырокай геаграфічнай прасторы. Пранікненне гэтай камунікатыўнай структуры ажыццяўлялася і на змястоўным узроўні. І перш за ўсё асабліва ў дачыненні да духоўнасці Вялікага княства Літоўскага можна гаварыць пра права і тыя колы палітычнага мыслення, што былі звязаныя з яго разуменнем і выкарыстаннем.

Сярэднявечны ўніверсітэт [5; 6] – гэта той стандарт не толькі з боку інтэлектуальнага зместу сістэмы ведаў, што ў ім выкладалася, але і самой арганізацыі гэтага працэсу, а таксама наступстваў праходжання яго для канкрэтнага чалавека. Заканчэнне канкрэтнай навучальнай установы, сярод усяго іншага давала чалавеку пэўны статус. Калі звярнуцца да гэтага працэсу менавіта ў сярэд-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нявечных умовах, то даўно было адзначана, што ў сярэдзіне гэтага перыяду такія ўстановы становяцца своеасаблівай чацвёртай іпастассю феадальнага грамадства. У якасці нагляднага прыкладу такога стану рэчаў звычайна прыводзяць сярэднявечны Парыж [6], які фарміраваўся як сімбіёз 4 гарадоў, у кожным з якіх нібы дзейнічала своя ўлада, а рэшткі гэтага падзелу захаваліся да гэтага часу. У Парыжы выразна выяўлены чатыры часткі – чыста гарадская, каралеўская, царкоўная і, нарэшце, знакаміты Лацінскі квартал, дзе здаўна размяшчаўся ўніверсітэт. У тую далёкую эпоху ў кожнай з частак была свая ўлада і свой суд.

XII–XVI стст. былі часам распаўсюджвання ўніверсітэтаў на еўрапейскім кантыненце, гэты працэс паступова прыводзіць да таго, што веды і адукаванасць становяцца вечнай каштоўнасцю, іншымі словамі – вучыцца становіцца модным. Калі, напрыклад, у эпоху Кіеўскай Русі, менавіта ў гэтым інтэлектуальным плане ў наяўнасці быў падзел паміж тымі, хто думаў, і тымі, хто фіксаваў гэтыя думкі, то далейшае развіццё адукацыі ў эпоху сярэднявечча прыводзіць да таго, што адукаванасць становіцца такой жа іпастассю персоны, якая займала высокае становішча ў сацыяльнай іерархіі, як, напрыклад, і ўменне ваяваць. А паломніцтва па веды ператвараецца ў важны напрамак сацыялізацыі. Але не толькі людзі ездзілі па адукацыю. Развіццё сістэмы ўніверсітэтаў прыводзіла да таго, што такая арганізацыя атрымання ведаў паступова заваёўвала новыя арэалы і ў гэтым дачыненні для нас важнымі з'яўляюцца тры даты. У 1579 г. адкрыўся Віленскі ўніверсітэт [7], аднак прыкладна за дзвесце пяцьдзясят гадоў да гэтага ўніверсітэты адкрыліся ў Празе (1347) і Кракаве (1364). І тут мы можам казаць пра рэгіянальны аспект распаўсюджвання гэтага віду адукаванасці на беларускія землі.

Геаграфічнае набліжэнне ў XIV–XV стст. гэтых ачагоў ведаў на фармальным узроўні прыводзіла да таго, што для многіх беларускіх інтэлектуалаў эпохі позняга сярэднявечча Кракаў і Прага станавіліся зыходнымі пунктамі на шляху па веды ў Еўропу. Такім чынам, тую парадыгму, што з пэўнай доляй умоўнасці можна назваць еўрапейскай сістэмай ведаў, можна таксама назваць чарговым інкультурацыйным узорам, які з пункту гледжання механізма ўздзеяння быў практычна падобны на хрысціянскую інвазію на беларускія землі. Як і папярэднія мадэлі інвазіі і цэнтравання, адукацыйная парадыгма паўтарала некаторыя агульнасці функцыянавання. І найперш тут можна адзначыць акадэмічнасць і запазненне. Вядома, прырода гэтага феномена цяпер ужо мела крыху іншы характар, чым гэта было ў часы ранняга сярэднявечча. Тады ў наяўнасці была нейкая штучная структура ведаў (шмат у чым прымусова прыўнесеная звонку), нейкі спецыяльны экспартны варыянт, прызначаны для хрысціянізацыі язычніцкіх народаў. Тут жа на самым пачатку еўрапейскай эпохі мае месца ўжо адкрытая сістэма ведаў, доступ да якой рэгулюецца перш за ўсё эканамічнымі фактарамі. Навучанне ў разглядаемы перыяд становіцца рамяством, а яго распаўсюджанне – спосабам росту дабрабыту. Таму магчымасці вышэйзначанага заходняга вектара, у тым ліку і беларуска-польска-чэшскага славянскага ўзаемадзеяння, сапраўды з'яўляюцца толькі на самым зыходзе сярэднявечча, калі побач з іншымі навацыямі рэнесансны ўплыў стымуляваў цікавасць як да народнай культуры, так і да тых высокіх узораў, што прапаноўваў "лацінскі свет".

Канец XV – пачатак XVI ст. у гісторыі Беларусі ўяўляе сабой новы рэвалюцыйны скачок, бо менавіта з гэтага часу пасля дзвюх хрысціянскіх інвазій мы зноў назіраем кардынальную ломку светапоглядных арыенціраў, імклівае назапашванне адукаванасці грамадства, выразнае пазначэнне магчымасцей быць "выбітнымі людзьмі". З іншага боку, тут мы можам заўважыць і відавочную сінхра-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нізацыю духоўнай культуры ВКЛ з галоўнымі трэндамі еўрапейскага гуманізму. У перыяд Адраджэння Вялікае княства Літоўскае канчаткова замацавала месца на кагнітыўнай мапе Еўропы ў якасці агульнапрызнанай еўрапейскай дзяржавы, у культуры якой знайшлі сваё ўвасабленне ўсе супярэчнасці палітычнага і духоўнага жыцця кантынента тых часоў.

У гэтым кантэксце мы павінны звярнуць увагу на самы важны фактар у пранікненні Рэнесансу на беларускія землі, на той феномен, які мы можам умоўна пазначыць як "сярэднявечны турызм". Гэта значыць, калі мы кажам, што дух Адраджэння пачаў пранікаць на тэрыторыю Беларусі дзесьці на пачатку 20-х гг. XVI ст., то перш, чым пачаць канкрэтны і змястоўны аналіз тых трансфармацый, якія выклікалі гэтае пранікненне, неабходна раскрыць сам механізм інвазіі, знайсці тыя канкрэтныя геаграфічныя шляхі і прычыну патрэбы людзей перасоўвацца па гэтых шляхах. А гэта значыць, што на кагнітыўнай мапе Еўропы таго перыяду варта пазначыць дзве кропкі (напрыклад, Полацк і Фларэнцыю), паглядзець, што і як іх звязвае ў сферы інтэлектуальнага ўзаемадзеяння ў гэтых геаграфічных каардынатах. У гэтай сувязі мы ўводзім канцэпт "сярэднявечны турызм" і лічым, што, нягледзячы на занадта сучаснае гучанне, ён дазволіць накіраваць гэтую частку дыскусіі пра характар і формы ўплыву Rinascimento на беларускую культуру ў патрэбнае рэчышча.

Як відаць на прыкладзе беларускага першадрукара, для "інтэлігенцыі" Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. паездкі ў Італію ўжо не былі чымсьці неардынарным. А людзі з беларускіх земляў перасталі здавацца незвычайнымі і таму варожымі. Больш таго, за гэты адносна кароткі час мяжа дзіўнага свету, той прасторы, наведванне якой здавалася падобным на вандраванне ў замагільны свет, усё больш адсоўваецца на ўсход. Пра гэта сведчыць нават самы павярхоўны аналіз мемуараў вандроўца таго часу (напрыклад, "Запіскі аб Масковіі" 1557 [8]), "родапачынальніка еўрапейскіх баечнікаў пра расійскую айчыну" Жыгімонта (Зігмунда) фон Герберштэйна (ням. Siegmund Freiherr von Herberstein), а таксама параўнанне гэтых тэкстаў з раннімі падобнымі тэкстамі.

Турызм усё ж нешта іншае, чым простае перасоўванне. Турыст адпраўляецца ў шлях не дзеля задавальнення сваіх вонкавых патрэб, а дзеля месца, куды ён едзе. Турыст імкнецца дасягнуць месца, пазнаць яго, а таксама павезці назад нешта духоўнае ці матэрыяльнае. Па сутнасці, турыст вязе з сабой культуру. На ўсім працягу свайго развіцця еўрапейская цывілізацыя была цэнтраванай цывілізацыяй. Гэта азначае, што цікавасць і дапытлівасць былі накіраваны да якога-небудзь цэнтра. І калі сучаснай карціне ўласціва так званая поліцэнтрычнасць, а палітычныя, эканамічныя і духоўныя цэнтры канкурыруюць паміж сабой, іншае было ў Сярэднявеччы. Тады, з прычыны саркастычнага стаўлення да іншых заняткаў, якія адрозніваліся ад "практыкаванняў духу" і ўзнёслага ўвасаблення духу ў матэрыю, цэнтрам цывілізацыі лічылася тое, куды імкнулася душа, а не цела. Да сярэдзіны XV ст. такім універсальным духоўным цэнтрам хрысціянскай цывілізацыі заставалася Палестына. З канца XV ст., у тым ліку ў сілу палітычных і эканамічных прычын, ролю такога цэнтра ўзяў на сябе Рым. Запусценне Палестыны ў непарыўным сінтэзе з Адраджэннем у Італіі спарадзіла і важныя змены ў сістэме сярэднявечнага турызму, калі маладыя людзі пачалі падарожнічаць не толькі з палітычнымі і рэлігійнымі мэтамі, але і з адукацыйна-культурнымі.

Як адзначаў Эдвард Чэйні, прыняўшы рымскую мадыфікацыю старажытнай грэчаскай цывілізацыі, гэтак жа як і адраджэнне гэтага гібрыда на працягу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Рэнесансу, Італія стала цэнтрам экстраардынарнага абаяння для маладых дзяржаў Паўночнай Еўропы пасля распаду сярэднявечнага хрысціянскага свету [9, с. 11]. Менавіта ў сярэдзіне XV ст. Італія выступіла як эмбрыён будучага Гранд Тура (пра Гранд Тур гл.: [9; 10]), які на працягу яшчэ некалькіх стагоддзяў будзе служыць завяршальным звяном у выхаванні еўрапейскай арыстакратыі, а ў больш шырокім сэнсе – першасным кансалідуючым пачаткам, які навязвае еўрапейскай інтэлігенцыі агульныя каштоўнасці, адзіныя падыходы да пазнання свету. Што да земляў Вялікага княства Літоўскага, то наш прыклад перасоўвання на світанку беларускага Адраджэння на ўсход кагнітыўных межаў той сацыякультурнай прасторы, якую мы цяпер традыцыйна завём Еўропай, ёсць прамое следства далучэння розных пластоў грамадства Вялікага княства Літоўскага да традыцый еўрапейскіх вандраванняў наогул і канонаў Гранд Тура ў прыватнасці.

Адраджэнне азначала для Беларусі, яе культуры і сацыяльнай структуры не толькі якасны, але і рэвалюцыйны скачок, бо менавіта з гэтага часу мы назіраем кардынальную ломку светапоглядных арыенціраў, кумулятыўнае назапашванне як агульнай адукаванасці соцыума, так і патэнцый быць "выбітнымі людзьмі", якія ў разглядаемы перыяд з'яўляліся галоўнай каштоўнасцю і прызнаваліся пераважнай рухаючай сілай рэнесанснага грамадства. Па сутнасці, гэтая радыкальная сінхранізацыя сацыяльнага і духоўнага жыцця ВКЛ з галоўнымі трэндамі еўрапейскага гуманізму (пры безумоўнай рэгіянальнай спецыфіцы) можа быць з поўным правам названа трэцяй (пасля праваслаўнай і каталіцкай інвазіі) інкультурацыяй беларускага грамадства.

Калі ж мы будзем тут выкарыстоўваць канцэпцыю Ж. Дзюбі [11], то зможам казаць і пра другую феадальную рэвалюцыю. Такі падыход стане правамерным абагульненнем відавочных працэсаў пераходу ад трохузроўневай структуры феадальнага агульнага Сярэднявечча да рэнесанснай мазаічнасці сацыяльнага жыцця і значных праяў чалавечай волі, змест якіх цяпер з'яўляецца не толькі гісторыяй беларускага Рэнесансу, але і важнай, прызнанай часткай сусветнай культурнай спадчыны.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. ***Джаксон, Т. Н.*** Austr Í Görðum: древнерусские топонимы в древнескандинавских источниках / Т. Н. Джаксон. – Москва : Яз. славян. культуры, 2001. – 207 с.
2. ***Йосипенко, С. Л.*** До витоків української модерності: українська ранньомодерна духовна культура в європейському контексті / С. Л. Йосипенко. – Київ : Український Центр духовної культури, 2008. – 392 с.
3. ***Симчич, М.*** Philosophia rationalis у Києво-Могилянський академії / М. Симчич. – Вінниця : О. Власюк, 2009. – 239 с.
4. ***Степин, В. С.*** Теоретическое знание: Структура, ист. эволюция / В. С. Степин. – Москва : Прогресс-Традиция, 2000. – 743 с.
5. ***Haskins, C. H.*** The rise of universities/ Charles Homer Haskins. – New York : Gordon Press, 1976. – p. cm.
6. ***Ferruolo, S. C.*** The origins of the university: the schools of Paris and their critics, 1100–1215 / St. Ferruolo. – Stanford, Calif. : Stanford University Press, 1985. – viii, 380 p.
7. ***Bielinski, J.*** Uniwersytet Wilenski : 1579–1831 3 / J. Bielinski. – Krakow : [s.n.], 1899. Vol. 1: – [8], 485, [482] s., [488] k. tabl.
8. Sigmund Herberstein Moscouia Sigmunds Freyherms zu Herberstain, Neyperg vnd Guetenhag u. verteutscht: anno 1557 / Sigmund Herberstein. – Wienn : Gedruckt zu Wienn in Osterreich durch Michael Zimmerman in S. Annen Hof, 1557. – n/a.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

9. ***Chaney, E.*** The evolution of the grand tour : Anglo-Italian cultural relations since the Renaissance / E. Chaney. – London ; Portland, OR : Frank Cass, 1998. – xx, 404 p.
10. ***Black, J.*** Italy and the grand tour/ J. Black. – New Haven : Yale University Press, 2003. – xi, 255 p.
11. ***Duby, G.*** Les trois ordres : ou, L'imaginaire du feмodalisme / G. Duby. – Paris : Gallimard, 1978. – 428 p.

Паступіў у рэдакцыю 08.07.2014 г.
Кантакты: walewr@gmail.com (Еворовский Валерий Борисович)

Summary

*From the standpoint of historical and philosophical reconstruction the author considers the dynamics of intellectual, geopolitical and axiological influence of the European cultural core on the philosophical development of Belarus in the XI–XVI centuries. The processes of the Christian enculturation and the Renaissance influences are consistently presented. Special attention is paid to the modifications of the major European ideas in the Belarusian intellectual culture. It is concluded that despite the delay Belarus successfully adapted European ideas and values.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова